На территории Беларуси количество почтовых учреждений при железнодорожных станциях было незначительным [13]. Во многом это связано с тем, что содержание одного волостного правления с почтовыми операциями обходилось дешевле, чем содержание почтового учреждения на железнодорожной станции. Как показывают статистические данные на территории Беларуси к 1914 г. услуги почтовой связи предоставляли всего 198 вспомогательных пунктов при волостных правлениях и на железнодорожных станциях.

Таким образом, во второй половине XIX – начале XX вв. большой популярностью в деле перевозки почтовых отправлений стал пользоваться железнодорожный транспорт. Почтовые перевозки не входили в сферу деятельности почтово-телеграфного ведомства, в связи с чем это нередко приводило к определённым проблемам, сказывающимся на качестве услуг. В связи с нехваткой почтовых учреждений почтово-телеграфное ведомство воспользовалось железнодорожными станциями для открытия при них приема и выдачи разного рода корреспонденции, образовав из этих учреждений вспомогательные почтовые учреждения. Однако большого распространения на территории Беларуси они не получили.

**Библиографические ссылки**


1. Соколов Н. И. Почта и телеграф в XIX столетии // Министерство внутренних дел. Исторический очерк. 1802-1902. [Приложение второе]. СПб.: Тип. МВД, 1901.
2. Базилевич К. В. Почта в России в XIX веке. М.: НКПиТ, 1927.
3. Ильштейн А. Железнодорожная почта России // Филателия. 1992. №11. С. 47–49.
4. Стеткевич А. Почта и телеграф в царствовании Александра III. Санкт-Петербург: Тип. МВД, 1901.
5. Извлечение из правил почтовых сношений, почтово-телеграфные округа, отделы перевозок почт, почтово-телеграфные и почтовые учреждения, волостные правления и железнодорожные станции, производящие почтовые операции, и почтовые вагоны / Сост. под. ред. И. И. Рклицкаго. СПб.: Тип. Министерства путей сообщения, 1909.
6. Материалы по истории связи в России XVIII по XX вв. Обзор документальных материалов / [Ф.И. Бунина, В.И. Вельбель, К.П. Генкина и др.]; под. ред. Н.А. Мальцевой. Л.: Ленингр. Типография №5 Главполитграфпрома СССР, 1966.
7. Цветков Л. Разъезды почтово-телеграфных чиновников // Минское слово. 1912. № 1478.
8. Бич. Почтовые недоразумения // Полесская жизнь: политическая, общественная и литературная газета. Гомель, 1911. № 44. С. 2.
9. О личном составе служащих, выдаче им содержания, путевых денег и пособий (Гомельского железнодорожного почтового отделения III отдела). (2 января 1912 – 7 января 1913) // НИАБ. Ф. 448. Оп. 1. Д. 49.
10. О штате управления перевозкой почт по железным дорогам // Почтово-телеграфный журнал (отдел официальный). 1891. № 8. С. 127–131.
11. Колосов Л. Л. Почта на колесах: железнодорожная почта в белорусских губерниях в конце XIX – начале XX в. // Веснік сувязі. 2013. № 2. С. 59–60.
12. Колосов Л. Л. Почта на колесах: железнодорожная почта в белорусских губерниях в конце XIX – начале XX в. // Веснік сувязі. 2013. № 3. С. 63–64.
13. Колосов, Л. Л. Железнодорожная почта в белорусских губерниях в конце XIX – начале XX вв. // Веснік сувязі. 1995. № 3. С. 63–64.


УДК 94(476)”19”+352.075(476)(091)

## САЦЫЯЛЬНЫ СКЛАД ЗЕМСКІХ НАЧАЛЬНІКАЎ ЯК МАРКЕР УРАДАВАЙ ПАЛІТЫКІ Ў БЕЛАРУСКІХ ГУБЕРНЯХ

***Г.А. Страленя***

*Беларускі дзяржаўны універсітэт, вул. Чырвонаармейская, 6, г. Мінск, Беларусь, as280388@mail.ru*

У артыкуле паказаны працэс фарміравання інстытута земскіх начальнікаў у беларускіх губернях, адлюстраваны крытэрыі адбору кандыдатаў, паказаны ўплыў урадавай палітыкі ў беларускіх губернях на асаблівасці саслоўнай і канфесійнай прыналежнасці і адукацыйны ўзровень земскіх начальнікаў. Аналіз сацыяльнага складу земскіх начальнікаў беларускіх губерняў дазволіў зрабіць выснову аб прамой залежнасці яго фарміравання ад напрамкаў урадавай палітыкі.

***Ключавыя словы**: земскія начальнікі; адміністрацыйныя і судовыя ўстановы; беларускія губерні.*

## СОЦИАЛЬНЫЙ СОСТАВ ЗЕМСКИХ НАЧАЛЬНИКОВ КАК МАРКЕР ПРАВИТЕЛЬСТВЕННОЙ ПОЛИТИКИ В БЕЛОРУССКИХ ГУБЕРНИЯХ

***А.А. Страленя***

*Белорусский государственный университет, ул. Красноармейская, 6, г. Минск, Беларусь, as280388@mail.ru*

В статье показан процесс формирования института земских начальников в белорусских губерниях, отражены критерии отбора кандидатов, показано влияние правительственной политики в белорусских губерниях на особенности сословной и конфессиональной принадлежности и образовательного уровня земских начальников. Анализ социального состава земских начальников белорусских губерний позволил сделать вывод о прямой зависимости его формирования от направлений правительственной политики.

***Ключевые слова:** земские начальники; административные и судебные учреждения; белорусские губернии.*

## SOCIAL COMPOSITION OF DISTR ICT CAPTAINS AS A MARKER OF THE GOVERNMENT POLICY IN BELARUSIAN PROVINCES

***H.Stralenia***

*Belarusian State University, Niezaliežnasci Avenue, 4, 220030, Minsk, Belarus, as280388@mail.ru*

The article depicts the process of formation of the institute of district captains in Belarusian provinces, reflects the selection of candidates criteria, shows the impact of the government policy in Belarusian provinces on the peculiarity of class and confessional affiliation and the educational level of district captains. The analysis of the social composition of district captains of the Belarusian provinces made it possible to conclude that its formation is directly dependent on government policy.

***Key words:** district captains; administrative and judicial institutions; the Belarusian province.*

Сацыяльны склад земскіх начальнікаў адлюстроўваў іх ролю ў рэалізацыі ўрадавай палітыкі ў сялянскім асяроддзі. Фарміраванне патрабаванняў да кандыдатаў на гэтую пасаду шмат у чым залежала ад напрамкаў урадавай палітыкі ў беларукіх губернях, што ў сваю чаргу абумовіла наяўнасць асаблівых рыс у кадравым складзе земскіх начальнікаў.

Згодна з «Палажэннем аб земскіх участковых начальніках», адным з асноўных крытэрыяў для прызначэння на пасаду земскага начальніка быў адзначаны 3-гадовы цэнз службы на пасадзе правадыра дваранства. Кандыдатамі на пасаду з'яўляліся і мясцовыя спадчынныя дваране старэйшыя за 25 гадоў, якія атрымалі адукацыю ў адной з вышэйшый навучальных устаноў Расійскай імперыі, або не менш 3-х гадоў займалі пасады міравога пасрэдніка, міравога суддзі, неадменнага члена па сялянскіх справах прысутнасці або земскага начальніка [5, с. 511]. Для прэтэндэнтаў на пасаду земскага начальніка з ліку мясцовых спадчынных дваран быў усталяваны маёмасны цэнз. Яны, іх жонкі ці бацькі павінны былі валодаць ў межах павета зямельнай уласнасцю або іншай нерухомай маёмасцю коштам не менш 7500 руб. [5, с. 511]. Пры недахопе кандыдатаў на пасаду маглі прэтэндаваць спадчынныя дваране, якія атрымалі сярэднюю адукацыю, але мелі ваенныя або грамадзянскія класныя чыны. Пры гэтым маёмасны цэнз для іх быў павялічаны ў 2 разы [5, с. 511]. На пасаду земскага начальніка маглі таксама прэтэндаваць мясцовыя спадчынныя дваране, якія не мелі адпаведнага маёмаснага цэнзу, але захавалі сядзібу ў межах дадзенага павета, пры гэтым атрымалі вышэйшую адукацыю, або не менш 3-х гадоў праслужылі на пасадзе міравога пасрэдніка, міравога суддзі, неадменнага члена па сялянскіх справах прысутнасці або земскага начальніка [5, с. 512]. Акрамя таго, міністру ўнутраных спраў пры недахопе кандыдатаў з мясцовых спадчынных дваран прадастаўлялася магчымасць прызначаць на дадзеную пасаду асоб, якія не належалі да гэтай катэгорыі, але скончылі вышэйшую або сярэднюю навучальную ўстанову [5, с. 512]. А ў дапаўненнях да закону ад 29 снежня 1889 г. міністр унутраных спраў атрымаў права прызначаць на дадзеную пасаду асоб, якія не атрымалі адукацыю, але, на яго думку, былі годнымі кандыдатамі і валодалі дастатковым аб'ёмам ведаў [2, с. 684]. Новы інстытут улады пачаў дзейнічаць у Віцебскай, Мінскай і Магілёўскай губернях толькі ў 1901 г., а ў Віленскай, Гродзенскай і Ковенскай губернях – ў 1903 г. [3 ,с. 762–764; 4, с. 687–689].

Пры фарміраванні корпуса земскіх начальнікаў у беларускіх губернях аказалася складаным вытрымаць пералічаныя вышэй патрабаванні. Гэта было абумоўлена накірункамі ўрадавай палітыкі, якая была скіравана на русіфікацыю беларускіх губерняў, што пэўным чынам адлюстравалася і на чыноўніцкім апараце. У другой палове XIX – пачатку XX ст. менавіта мерапрыемствы па русіфікацыі беларускіх губерняў становяцца галоўным стрыжнем правядзення ўрадавай палітыкі [11, с. 21]. У гэтай сувязі галоўнай перашкодай для ўвядзення пасады земскіх начальнікаў у беларускіх губернях урад лічыў недастатковую колькасць паменснага праваслаўнага дваранства, на якое, на думку ініцыятараў рэформы графа Дз. А. Талстога і А. Дз. Пазухіна, неабходна было зрабіць асноўны ўпор пры фарміраванні персанальнага складу новай улады [14, с. 59]. Нягледзячы на тое, што іх доля да пачатку XX ст. у беларускіх губернях ўзрасла, яна ўсё роўна значна саступала колькасці памесных дваран-каталікоў. Па падліках А. П. Жытко, на 1904 г. колькасць праваслаўных спадчынных дваран у Мінскай губерні складала 1664 чалавека (34,7 %), у Магілёўскай 1492 чалавека (45 %), у Віленскай 397 (8,4 %), у Віцебскай 524 (30,3 %) і Гродзенскай 288 (16,6 %) [9, с. 83–84]. Перашкодай для ўвядзення новай пасады стала не толькі перавага спадчынных дваран-землеўласнікаў каталіцкага веравызнання, але і тое, што ў многіх выпадках зямельная ўласнасць толькі фармальна належала асобам праваслаўнага веравызнання [10, с. 195].

Асаблівае значэнне прыналежнасці да паместнага праваслаўнага дваранства пры фарміраванні кадравага складу новага інстытута ўлады надаваў і міністр унутраных спраў Дз. С. Сіпягін. Аднак на практыцы укамплектаваць ўвесь штат земскіх начальнікаў нават прадстаўнікамі дваранскага саслоўя не ўдавалася. Паводле дадзеных па Мінскай губерні за 1901г. з 66 прызначаных земскіх начальнікаў 61 з’яўляліся дваранамі, 4 не з’яўляліся прадстаўнікамі спадчыннага дваранства, але мелі чын на грамадзянскай або ваеннай службе [15, л. 86; 180; 191; 16, л. 2–60; с. 100]. У Магілёўскай губерні ў 1903 г. 48 земскіх начальнікаў належалі да дваранскага саслоўя, 3 паходзілі з іншых саслоўяў, 3 пасады былі вакантнымі [17, с. 286–305]. У Віцебскай губерніі ў 1903 г. штат земскіх начальнікаў быў укамплектаваны 47 дваранамі, 2 земскіх начальніка былі прадстаўнікамі іншых саслоўяў, 1 пасада заставалася вакантнай [17, с. 32–49].

Пры камплектаванні штата земскіх начальнікаў у беларускіх губернях не заўсёды выконваўся яшчэ адзін прынцып – прыналежнасць да мясцовага дваранства. Да прыкладу, па дадзеных на 1903 г. у Мінскай губерні з 59 земскіх начальнікаў, якія належалі да вышэйшага саслоўя, толькі 4 паходзілі з дваран Мінскай губерні, 39 былі ўраджэнцамі іншых губерняў Расійскай імперыі, у тым ліку 5 з іх распараджаліся зямельнай уласнасцю ў беларускіх губернях, аб 16 земскіх начальніках дадзеныя адсутнічалі [17, с. 262–285]. У Віцебскай губерні з 47 земскіх начальнікаў дваранскага паходжання 6 належалі да ліку вышэйшага саслоўя дадзенай губерні, 23 паходзілі з іншых губерняў Расійскай імперыі, аб 18 земскіх начальніках дадзеныя адсутнічалі. Толькі 10 земскіх начальнікаў Віцебскай губерні валодалі зямельнай уласнасцю на тэрыторыі беларускіх губерняў [17, с. 32–49]. У Магілёўскай губерні 9 земскіх начальнікаў з ліку дваран належалі да вышэйшага саслоўя дадзенай губерні, 26 з'яўляліся выхадцамі з іншых губерняў, аб 13 земскіх начальніках дадзеныя адсутнічалі. Акрамя таго, 15 з 48 земскіх начальнікаў Магілёўскай губерні валодалі нерухомай маёмасцю ў беларускіх губернях [17, с. 286–305]. Камплектаванне штата новага інстытута ўлады прадстаўнікамі дваранскага саслоўя іншых рэгіёнаў Расійскай імперыі з'яўляецца характэрнай асаблівасцю беларускіх губерняў. Для параўнання са 110 земскіх начальнікаў Тамбоўскай губерні за ўвесь перыяд іх дзейнасці 92 земскіх начальніка з'яўляліся мясцовымі спадчыннымі дваранамі [1, с. 56]. Жалаванне земскіх начальнікаў беларускіх губерняў было вышэй, чым у іншых рэгіёнах Расійскай імперыі і складала для Мінскай, Віцебскай і Магілёўскай губерняў 2800 тыс. руб. у год [3, с. 764]. Да прыкладу, у той жа Тамбоўскай губерні земскія начальнікі атрымлівалі 2200 руб. у год [1, с. 48]. Падобная розніца ў матэрыяльным забеспячэнні была выкліканая тым, што большасць асоб, якія былі прызначаны на пасады земскіх начальнікаў у беларускіх губернях былі выхадцамі з іншых рэгіёнаў Расійскай імперыі і жалаванне ў большасці выпадкаў з'яўлялася адзінай крыніцай прыбытку.

У сувязі з недахопам мясцовага праваслаўнага дваранства менавіта адукацыйны цэнз планаваўся як адзін з найбольш важных крытэрыяў пры выбары кандыдатаў на гэту пасаду ў беларускіх губернях. Да прыкладу, 5-ы ўчастак Ігуменскага павета Мінскай губерні быў вакантным ў сувязі са смерцю 12 лістапада 1901 г. земскага начальніка

калежскага асэсара Сіцынскага. Мінскі губернатар звярнуўся з просьбай аб прызначэнні на гэтую пасаду М.І. Кірыеўскага, які паходзіў са спадчынных дваран Калужскай губерні [16, л. 24–25]. У Мінскай губерні ні ён, ні яго сваякі не валодалі зямельнай уласнасцю. Аднак дадзены кандыдат падыходзіў па адукацыйнаму цэнз, ён скончыў юрыдычны факультэт Маскоўскага універсітэта. Гэта стала вырашальным фактарам пры яго прызначэнні на пасаду [15, л. 86].

На практыцы вопыт дзяржаўнай службы быў усё ж пераважней адукацыйнага цэнзу. Акрамя таго, большасць земскіх начальнікаў скончылі ваенныя навучальныя ўстановы або мелі вопыт ваеннай службы. Па дадзеных на 1903 г., 26 з 66 прызначаных земскіх начальнікаў Мінскай губерні атрымалі вышэйшую або сярэднюю грамадзянскую адукацыю, у тым ліку універсітэцкі дыплом – 14 чалавек. Незавершаную вышэйшую адукацыю мелі 3 земскіх начальніка, 1 – незавершаную сярэднюю. Ваенныя навучальныя ўстановы скончылі 36 земскіх начальнікаў [17, с. 262–285]. У Магілёўскай губерні па дадзеных за гэты перыяд 18 земскіх начальнікаў (з 51-го прызначанага) мелі вышэйшую або сярэднюю грамадзянскую адукацыя, 8 з іх скончылі універсітэт. Незавершаная вышэйшая адукацыя было ў 6 земскіх начальнікаў, незавершаная сярэдняя адукацыя – у 2. Ваенную адукацыю атрымалі 23 земскіх начальніка, 1 – няскончаную ваенную адукацыю. Прыватную навучальную ўстанову скончыў 1 земскі начальнік [17, с. 286–305]. У Віцебскай губерні, па дадзеных на 1903 г., з 49 земскіх начальнікаў 14 мелі вышэйшую або сярэднюю грамадзянскую адукацыю (6 з іх атрымалі універсітэцкую адукацыю), незавершаную вышэйшую і сярэднюю адукацыю атрымалі 4 земскіх начальніка. Асноўная частка (30 чалавек) атрымала ваенную адукацыю, 1 – няскончаную ваенную адукацыю [17, с. 32–49]. У цэлым, такая сітуацыя была характэрная не толькі для беларускіх губерняў, але і для іншых рэгіёнаў Расійскай імперыі, дзе быў уведзены інстытут земскіх начальнікаў. Паводле «Спісу службовых асоб па ведамству Міністэрства ўнутраных спраў у губернях, абласцях і гораданачальствах на 1900 год» імкненне ўрада прызначыць на пасаду земскага начальніка асоб, якія атрымалі вышэйшую адукацыю, не ажыццявілася на практыцы. З 2012 земскіх начальнікаў толькі 620 чалавек скончылі вышэйшыя навучальныя ўстановы (30,80%), завершаную сярэднюю адукацыю мелі 1061 (53, 73%), няскончаная сярэдняя і вышэйшая адукацыя была ў 240 чалавек (11, 87%), атрымалі хатнюю адукацыю і скончылі прыватныя пансіёны 59 земскіх начальнікаў (2,93%), па 32 асобам (1,09%) дадзеныя адсутнічалі [12, с. 106]. Значная частка земскіх начальнікаў (43,74%) атрымалі ваенную адукацыю [12, с. 104]. Асноўнай прычынай таго, што на пасаду земскіх начальнікаў прэтэндавалі у большасці выпадкаў «адстаўныя штык-юнкеры», адзін з земскіх начальнікаў Курскай губерні назваў вялізную колькасць абавязкаў і нізкае жалаванне яго калег. На яго думку, пасада земскага начальніка ўяўляла «вельмі мала прывабнага, у выпадку вакансіі, гэтага месца дамагаюцца толькі тыя асобы, якія ці не маглі знайсці нічога лепшага ці займаюць месца земскага начальніка часова, як пераходную прыступку да іншых, больш жаданых пасад» [8, с. 8].

У адпаведнасці з задачамі, якія ставіліся перад земскімі начальнікамі урадам, асабліва па ўмацаванні «рускага ўплыву», асноўны ўпор пры прызначэнні на гэту пасаду быў зроблены на прадстаўнікоў праваслаўнага або лютэранскага веравызнання. Пераважная большасць земскіх начальнікаў Мінскай губерні (62 з 66 прызначаных земскіх начальнікаў), па дадзеных за 1903 г., была праваслаўнага веравызнання, 4 земскіх начальніка прытрымліваліся лютэранскага веравызнання [17, с. 262–285]. У Віцебскай губерні 47 з 49 земскіх начальнікаў былі праваслаўнага веравызнання, 2 – лютэранамі [17, с. 32–49]. У Магілёўскай губерні, па дадзеных за гэты перыяд, 49 земскіх начальнікаў з 51 былі праваслаўнымі, 2 – лютэранамі [17, с. 286–305]. У Віленскай губерні, па дадзеных 1904 г., 43 з 52 земскіх начальнікаў былі праваслаўнага веравызнання, 4 – лютэранамі, 3 – каталікамі, 1 – мусульманінам, па 1 земскаму начальніку дадзеных не было [18, с. 55–61]. У Гродзенскай губерні, па дадзеных 1904 г., 41 з 48 прызначаных земскіх начальнікаў былі праваслаўнага веравызнання, 3 – лютэранамі, 2 – каталікамі, па 2 земскім начальнікам дадзеныя адсутнічалі [18, с. 153–158]. Варта адзначыць, што толькі ў Гродзенскай і Віленскай губернях у лік земскіх начальнікаў былі ўключаныя асобныя прадстаўнікі каталіцкага веравызнання. У сувязі з гэтым ковенскі губернатар паведамляў віленскаму генерал-губернатару, што з часу паўстання 1863 г. мясцовыя памешчыкі каталіцкага веравызнання ўпершыню дапускаліся да пытанняў кіравання ў губернях. Ён адзначаў, што на гэтую пасаду мясцовыя дваране-каталікі праходзілі пільны адбор і апраўдалі аказаны ім давер [13, л. 10].

Пры прызначэнні на пасаду земскіх начальнікаў прысутнічаў і пратэкцыянізм з боку вышэйстаячых чыноўнікаў. Да прыкладу, старшыня Екацярынбургскага акруговага суда стацкі саветнік барон Медэм хадайнічаў аб пераводзе свайго зяця земскага начальніка надворнага саветніка Іванова з Пермскай губерні ў межы Віленскага генерал-губернатарства па прычыне слабога здароўя сваёй дачкі і неспрыяльных кліматычных умоў Пермскай губерні [6, л. 9].

Асаблівая ўвага пры выбары кандыдатаў надавалася звесткам з папярэдняга месца службы і асабістым дадзеным. Пра кандыдатаў, якія падалі хадайніцтва, старанна збіраліся звесткі, у тым ліку аб іх веравызнанні, адукацыйным цэнзе, службовых і маральных якасцях [6, л. 76]. Да прыкладу, кандыдату ў земскія начальнікі Магілёўскай губерні, юрысту Краснапольскаму, нягледзячы на спрыяльны водгук магілёўскага губернатара, было адмоўлена па прычыне неспрыяльных прыватных звестак ад яго калег-юрыстаў, якія паказалі, што Краснапольскі заключаў здзелкі з яўрэямі па куплі маёнткаў [7, л. 73]. На пасадзе земскага начальніка было адмоўлена і В. Іспалатаву, які атрымаў неспрыяльныя водгукі стаўрапольскага і аланецкага губернатараў, дзе адзначалася, што ён пакінуў папярэдняе месца службы земскім начальнікам з-за шматлікіх пазык у падпарадкаваных яму асоб [7, л. 74].

Фарміраванне асабістага складу інстытута земскіх начальнікаў у беларускіх губернях было падпарадкавана некалькім напрамкам. З аднаго боку, пры фарміраванні кадравага складу ўлічваліся агульныя патрабаванні, якія былі аформлены ў «Палажэнні аб земскіх участковых начальніках». У гэтай сувязі прыярытэт пры выбары на пасаду аддаваўся мясцовым спадчынным дваранам праваслаўнага веравызнання. З іншага боку, фарміраванне корпуса земскіх начальнікаў напрамую залежала ад урадавых задач у беларускіх губернях. У залежнасці ад змены задач мяняліся і патрабаванні да кандыдатаў на пасаду. У беларускіх губернях акцэнт быў зроблены на адукацыйны цэнз, вопыт дзяржаўнай службы і палітычную добранадзейнасць кандыдатаў. Пры фарміраванні складу земскіх начальнікаў вылучылася яшчэ адна характэрная рыса беларускіх губерняў–прызначэнне на гэтую пасаду прадстаўнікоў дваранскага саслоўя іншых губерняў Расійскай імперыі. Гэта было звязана з недаверам ўрада да мясцовых памешчыкаў каталіцкага веравызнання. У склад земскіх начальнікаў у якасці выключэння былі дапушчаны кандыдаты каталіцкага веравызнання, што сведчыла пра імкненне ўрада прыцягнуць на свой бок больш лаяльных прадстаўнікоў мясцовага дваранства.

**Бібліяграфічныя спасылкі**


1. Бузанова Н. А. Земские начальники Тамбовской губернии (1889–1917 гг.) : дис. … канд. ист. наук : 07.00.02. Тамбов, 2005.
2. Высочайше утвержденное мнение Государственного Совета о некоторых изменениях и дополнениях в Высочайше утвержденных, 12 июля 1889 года, законоположениях о преобразовании местных крестьянских и судебных учреждений и о приведении в действие сих законоположений в шести губерниях : 29 дек. 1889 г., № 6482 // Полное собрание законов Российской империи (ПСЗРИ). Собрание 3 : в 33 т. СПб., 1891. Т. 9. С. 684–685.
3. Высочайше утвержденное мнение Государственного Совета о распространении законоположений 12 июля 1889 года о преобразовании крестьянских и судебных учреждений на губернии Витебскую, Минскую и Могилевскую : 12 июня 1900 г., № 18854 // Полное собрание законов Российской империи. Собрание 3 : в 33 т. СПб., 1900. Т. 20. С. 762–764.
4. Высочайше утвержденное мнение Государственного Совета о распространении законоположений 12 июля 1889 года на губернии Виленскую, Гродненскую и Ковенскую и об ассигнование необходимых на сие кредитов : 8 июня 1903 г., № 23106 // ПСЗРИ. Собрание 3 : в 33 т. СПб., 1903. Т. 23. С. 687–689.
5. Высочайше утвержденное Положение о земских участковых начальниках : 12 июля 1889 г., № 6196 // ПСЗРИ. Собрание 3 : в 33 т. СПб., 1891. Т. 9. С. 508–535.
6. Дело о представлении должности земского начальника в пределах Виленского генерал-губернаторства // ДГАЛ. Ф. 378. Воп. 111. Спр. 70.
7. Дело о представлении должности земского начальника в пределах Виленского генерал-губернаторства // ДГАЛ. Ф. 378. Воп. 111. Спр. 73.
8. Жевахов Н. Письма земского начальника // Гражданин. 1904. 12 февр. С. 7–10.
9. Жытко А. П. Дваранства Беларусі перыяду капіталізму, 186–1914 гг. Мінск : Беларус. дзярж. пед. ун-т, 2003.
10. Каханоўскі А. Г. Сацыяльная трансфармацыя беларускага грамадства (1861–1914 гг.). Мінск : БДУ, 2013.

11. Каханоўскі А. Г. Уніфікацыя і русіфікацыя як накірункі ўрадавай палітыкі на тэрыторыі Беларусі ў другой палове XIX–пачатку XX ст. // Российские и славянские исследования : науч. сб. Вып. 6 / редкол. : А.П. Сальков, О.А. Яновский (отв. ред.) [и др.]. Минск: БГУ, 2011. С. 20–26.
12. М. К. Образовательный ценз земских начальников // Рус. богатство. 1901. № 4. С. 104–107.
13. Отчеты о состоянии губерний Северо-Западного края за 1903 г. // ДГАЛ. Ф. 378. Воп. 112. Спр. 129.
14. Пазухин, А. Д. Современное состояние России и сословный вопрос. М. : Унив. тип.: М. Катков, 1886.
15. Сведения о личном составе судебно-административных учреждений Минской губернии с 1-го октября 1901 г. // НГАБ. Ф. 1595. Воп. 1. Спр. 306.
16. Сведения о личном составе уездных съездов по Минской губернии за 1901–1902 гг. // НГАБ. Ф. 1595. Воп. 1. Спр. 305.
17. Список должностных лиц крестьянских учреждений в местностях, в коих введено в действие Положение о земских участковых начальниках / изд. Зем. отд. М-ва внутр. дел. СПб.: Тип. М-ва внутр. дел, 1903.
18. Список лиц, служащих по ведомству Министерства внутренних дел в губерниях, областях и градоначальствах, а также высших чинов наместничества на Дальнем Востоке и областей, находящихся в ведении Военного Министерства 1904 года : в 2 ч. / изд. М-ва внутр. дел. СПб.: Тип. М-ва внутр. дел. Ч. 2. 1904.

УДК 355.257.72(476)+94(476)

## РЕПРЕССИВНЫЕ МЕРЫ ПРОТИВ УНИАТСКОГО ДУХОВЕНСТВА, НЕ ПРИНЯВШЕГО ОПРЕДЕЛЕНИЙ ПОЛОЦКОГО ЦЕРКОВНОГО СОБОРА 1839 г.

***В.А. Теплова***

*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь, teplova_val@mail.ru*

В статье рассматривается судьба униатского духовенства Полоцкой и Литовской униатских епархий, не принявшего определений Полоцкого церковного Собора, делается вывод о том, что репрессивные действия в отношении представителей греко-католического клира предпринимались не государственными властями, а униатским епархиальным начальством в рамках церковных канонов и традиций.

***Ключевые слова:*** *Полоцкий церковный Собор; униатское духовенство; репрессивные меры; церковные каноны.*

## РЭПРЭСІЎНЫЯ МЕРЫ СУПРАЦЬ УНІЯЦКАГА ДУХАВЕНСТВА, ЯКОЕ НЕ ПРЫНЯЛО АЗНАЧЭННЯЎ ПОЛАЦКАГА ЦАРКОЎНАГА САБОРА 1839 г.

***В.А. Цяплова***

*Беларускі дзяржаўны універсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь, tatstsyana98@mail.ru*

У артыкуле разглядаецца лёс уніяцкага духавенства Полацкай і Літоўскай ўніяцкіх дыяцэзій, якое не прыняло азначэнняў Полацкага царкоўнага Сабора, робіцца выснова аб тым, што рэпрэсіўныя дзеянні ў дачыненні да прадстаўнікоў грэка-каталіцкага кліру прадпрымаліся не дзяржаўнымі ўладамі, а уніяцкім дыяцэзіяльным начальствам ў рамках царкоўных канонаў і традыцый.

***Ключавыя словы:*** *Полацкі царкоўны Сабор; уніяцкае духавенства; рэпрэсіўныя меры; царкоўныя каноны.*

## REPRESSIVE MEASURES AGAINST THE UNIATE CLERLY, WHO DIDN'T ADOPT THE DEFINITIONS OF THE POLOTSK CHURCH CATHEDRAL OF 1839

***V.A. Teplova***

*Belarusian State University, Niezaliežnasci Avenue, 4, 220030, Minsk, Belarus, teplova_val@mail.ru*

The article considers the fate of the Uniate clergy of the Polotsk and Lithuanian Uniate dioceses, who did'tadopt the definitions of the Polotsk Church Cathedral, concludes that repressive actions against representatives of the Greek-Catholic cleric were taken not by the state authorities, but by the Uniate diocesan superiors within the framework of church canons and traditions.

***Key words:*** *Polotsk Church Cathedral; Uniate clergy; repressive measures; church canons.*